## Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва
## Да Дня маці і Дня бацькі

# “Насіце на руках бацькоў…” (Ул. Караткевіч)



Асабістыя архівы дзеячаў літаратуры і мастацтва ўтрымліваюць унікальныя дакументы, многія з якіх распавядаюць сямейныя гісторыі. У іх знакамітасці выступаюць найперш як сыны і дочкі сваіх бацькоў, а таксама як клапатлівыя маці і бацькі для сваіх дзяцей.

Бацькі паэта Язэпа Пушчы – Павел Вікенцьевіч і Міхаліна Вікенцьеўна Плашчынскія. 1924.

Паэт Рыгор Папараць з бацькамі (Сапун Макар Міхайлавіч і Ева Станіславаўна) і сёстрамі. 1917-1918.

1



2



**Фотаздымкі, лісты, машынапісы, мастацкія творы і іншыя дакументы з фондаў архіва-музея, якія прадстаўлены на выставе, адкрываюць творчых людзей з кранальнага боку – матчынага і бацькоўскага.**

Маці гісторыка, літаратуразнаўцы Віталя Скалабана з сынам Валянцінам і ўнукам Уладзімірам. Падзея на фота – 90-годдзе жанчыны. 2004.

Артыстка Ларыса Александроўская ў дзяцінстве з сям’ёй. На фота Ларыса з гітарай, яе бацька Пампей Васільевіч з маці – у цэнтры. 1913.

3



4



# Кандрат Крапіва

Нязвыкла клапатлівым і пяшчотным бацькам прадстае ў лістах да сына Ігара вядомы байкапісец, сатырык Кандрат Крапіва: *“…маці крыху сумуе, але пагаворыць з табой і ёй весялей. Але тэлефонных размоў мала. Ты не лянуйся пісаць…19/IX-1947 г.”*.

5



[illegible] тебе собирает помаленьку маленькую посылочку, надо сбить фанерный ящичек, мы попробуем это сделать или перешлем кем нибудь. Прошу тебя не скучай, привыкай к новой обстановке, к людям. На днях была у меня Зоя, она очень много занимается, пишет тебе. Сегодня хотели с тобой говорить, но у вас там что-то с телефоном получилось. Очень жаль что ты так рано уехал. Пиши есть ли у тебя товарищи, где бываешь, что делаешь, пиши не ленись, хоть пару слов. Привет тебе от Людочки, от папы.

Целуем тебя,

твоя мама.

1947 г. 25/IX.

Привет Нине Игнатьевне и всему их семейству.

6



жыццё ідзе звычайным заведзеным парадкам, толькі цябе няхапае. Маці крыху сумуе, але пагаворыць з табой і ёй весялей. Але тэлефонных размоў мала. Ты не лянуйся пісаць. Напішы як цябе сустрэў Андрэевіч? Якое ўражанне зробіў на цябе дырэктар інстытута (Тэвэльмейер, здаецца). Па тэлефоне мы будзем званіць часта. Трэба мы з табой дамовімся, у якія дні і гадзіны нам з табой размаўляць.

А пакуль што — бывай здароў.

Цалуем цябе ўсёй сям'ёй

Твой бацька

19/IX-1947 г.

Лісты Кандрата Крапівы і яго жонкі Алены Канстанцінаўны да сына Ігара. 1947

# Іван Мележ

У фондзе Івана Мележа захоўваецца вялікая колькасць лістоў ад бацькі пісьменніка – Паўла Фёдаравіча. У іх – і гонар за сына, і расповяды аб буднях вёскі, і падрабязныя адказы на пытанні сына-пісьменніка аб глінішчанскіх традыцыях (потым будуць адлюстраваны ў вядомых раманах).

*“Дарагі сын Ваня!. Я…радуюся і ганаруся табою, як выхадзец з такой глушы і такой беднай сям’і, а дзякуючы сваёй стараннасці да вучобы і таленту ты дасягнуў вышэйшай адукацыі і цяпер рухаешся ў вышэйшым коле грамадства, без усялякай бацькоўскай дапамогі…Застаюся Ваш бацька і добразычліўца П. Мележ. 13/III-49”.*

7



Пісьменнік Іван Мележ ля бацькоўскага дома ў в. Глінішчы з маці Марыяй Дзянісаўнай, братам Расціславам і дачкой Людмілай. 1950-я.

Пісьменнік Іван Мележ з бацькам Паўлам Фёдаравічам ля магілы маці Марыі Дзянісаўны. 1965.

8




Выше черты не пишите!

Ниже черты не пишите!

# Іван Мележ

"...ты Ваня наша святло, ты падмурак нашага Жыцця...2/II-54".

"Мяне запрашалі на канферэнцыю ў Глінішчанскі клуб расказваць тваю біяграфію... 27/XI-60".

"Глінішчанскі Іван з Мележаўскай пароды стаў беларускім пісьменнікам... 13/III-49"

Ліст да пісьменніка Івана Мележа ад бацькі. Снежань 1943-студзень 1944.

# Стэфанія Станюта

У фондзе Саюза мастакоў БССР захаваліся дакументы вядомага мастака Міхася Станюты – бацькі знакамітай актрысы Стэфаніі Станюты. Аўтабіяграфія, напісаная мастаком, нагадвае замалёўкі з натуры мінскага культурніцкага асяроддзя пачатку XX стагоддзя, у якім вырасла Стэфанія.




Аўтапартрэт мастака Міхася Станюты – бацькі актрысы Стэфаніі Станюты. 1935.

М. Станюта. Партрэт дачкі. 1923.



# Стэфанія Станюта

12

Автобиография

Родился я 18 сентября (по ст. ст.) 1881 г. в г. Игумене, ныне г. Червень. Отец Петр Фадеевич Станюта служил в Игуменской Городской Мещанской Управе в качестве гласного (выборного), мать моя Стефания Александровна, урожден. Юшкевич-Дулевич занималась домашним хозяйством. Недвижимым имуществом родители мои не владели, торговлей не занимались. Детство свое я провел частично в г. Игумене, а остальное время в г. Минске. Рисованием увлекся еще мальчиком: рисовал "как мог" и "что мог". Помню, живя в Гомеле, мать на день уходила на работу в "театр", а я весь вечер, до ея прихода срисовывал с книжных картинок. По приезде в Минск меня начали обучать грамоте. Одно время, готовясь для поступления в реальное училище, [illegible] учителем-репетитором был [illegible] в 1906 г. бомбу губернатора Курлова. По окончании учебы в училище я принят был на работу к Старшему нотариусу г. Минска. Благодаря моему красивому почерку мне была назначена месячная зарплата 10 руб (это по то время была большая плата для писца: обыкновенно начинающим писцам 5 руб в месяц). В первую же получку я купил себе акварельных красок и 2 кисточки. Раньше я рисовал только карандашом и пером. Свободное время от работы я по прежнему рисовал карандашом и акварелью. Частенько захаживал в иконописную мастерскую худ. Курбатова. У него я познакомился с художн. Ермаковым (преподавателем рисования гимназии) просмотрев мои рисунки, он предложил мне позаниматься у него. Работал я под его руководством 2 года. Познакомился с худ. Гофманом, Яременко, Бонч-Осмоловским (отцом). Это знакомство принесло мне много пользы и [illegible]. В 1909 г. поселился в Минске художник Я. Кругер и открыл курсы рисования и живописи. Я не замедлил поступить к нему на курсы, проработав у него 3 года. На курсы приходила частенько Л. Мрочковская. Это была образованная женщина: владела французским и английским языками; переводила статьи и романы на русский язык. Бывала в Париже. Лично была знакома с Гюи Мопассаном, посещала Салон, Лувр. Много интересного нам сообщала, когда собирались у нее по вторникам вечерами. Собирались по рисованию с натуры стариков и старушек, [illegible] у неё на кухне в качестве натурщиков. Собирались в 7 ч. вечера и рисовали до 10. После этого был чай и закуска. Приходили на рисунок аккуратно. Постоянными посетителями рисунка были: Я. Кругер, Тамарович, я и Кудре[illegible]. Это было в 1913 и 1914 г. В это время я работал в литографии [illegible]. В 1915 году художник-декоратор, гастролировавший в Минске русского Московского театра, Е. Зазулин задумал [illegible] выставку и попросил меня помочь ему пригласить [illegible]

Аўтабіяграфія мастака М. Станюты 1945.

Асабовая картка члена Саюза савецкіх мастакоў М. Станюты 1951.

13



## Личная карточка

члена (~~кандидата~~)
Союза Советских Художников

Фамилия: Станюта
Имя: Михаил  Отчество: Петрович
Пол: муж.  3. Год и м-ц рождения: 1881 сентябрь
Место рождения по существующему адм. делению: г. Червень

Национальность: белорус  6. Соц. происхождение:
Бывшее сословие (звание) родителей: мещане
Основное занятие родителей до Октябрьской революции: отец служил выборным в Мещанской Управе в г. Игумене (теперь г. Червень), а мать занималась домашним хозяйством
до Октябрьской революции
Основные профессии (занятия) за период трудовой деятельности: зав. "/отр. [illegible]"
Общий трудовой стаж: с 1900 года
Соц. положение: служащий  9. Партийность: —
Какой организацией принят в члены ВКП(б)
Стаж (месяц, год вступления)  № партбилета  или к/карт.
Стаж пребывания в ВЛКСМ с  по  11. Состоял ли в других партиях (каких, какого и по какое время)
Состоял ли ранее в ВКП(б) (да, нет)  с какого и по какое время
Причины исключения или выбытия
Были ли колебания в проведении линии партии и участвовали ли в оппозициях (каких, когда)

Член какого профсоюза, с какого года: Рабиса с 1924
Образование: среднее

| Подробное название учебного заведения (вуза, втуза, техникума, комвуза, школы и проч.) и его местонахождение | Название факультета или отделения | Дата (м-ц, год) поступления | Дата (м-ц, год) окончания | Окончил или нет | Если не окончил, то с какого курса ушел | Какую (узкую) специальность получил в результате окончания высшего или специального среднего учебного заведения |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Московские Государственные Свободные Художественные мастерские | живопись | 1917 | 1920 | нет | с 4-го | преподавание рисования и черчения в средних школах "и работ. в [illegible]" |

# Янка Брыль

14




Невялікі ліст маці Янкі Брыля – Анастасіі, складзены трохкутнічкам – шчымлівы водгук ваеннага часу. З дакумента можна даведацца не толькі непасрэдную тэкставую інфармацыю, але і счытаць код грамадскіх і сямейных адносінаў. Гэта і беларуская гаворка жанчыны, якая стараецца пісаць па-руску (“спешу паведамить”, “в вашай маладой жызьни”), і матчына любоў не толькі да сына, але і да нявесткі (“дарагія дзеткі”, “ваша мамаша”), і адрасаванне ліста сыну ў Саюз пісьменнікаў (“палучыть: Брыль Ивану Антонавичу”), і штамп-дазвол ад ваеннай цэнзуры.

15




Ліст маці Анастасіі да пісьменніка Янкі Брыля і яго жонкі. 18.04.1945.

# Паўлюк Трус

9 лістоў, напісаныя ў 1927-28 гг. бацькам Адамам Емяльянавічам сыну – паэту Паўлюку Трусу – пачынаюцца аднолькава: “Дарагі наш сын Паўлюк”. Фанематычнае пісьмо пажылога чалавека перадае жывы гукапіс народнай гаворкі, многія словы зліваюцца і цяжка расчытваюцца сучасным вокам. Ва ўсіх лістах – туга бацькі аб нястачах і беднасці, просьбы дапамагчы грашыма (“так што прыходзіцца паследняга парсюка прадаць”) і хаця б ношаным адзеннем (“можа ў цябе естяка што падношанае дык прышлі”).

Згадвае бацька і пра хворую маці Паўлюка – Ганну Міхайлаўну: “Маміна галава баліць і зуб ужо даўно баліць” (маці неўзабаве памерла).

Скрозь усе допісы бацька выказвае свае перажыванні, ці не захварэў сын. Лісты сталі нібы прарочымі: летам 1929 г. Паўлюк Трус раптоўна памёр ад тыфу. Яму было 25 гадоў.

*“Дарагі наш сын Паўлюк. Нешта ты на нас вельмі моцна забыўся і не хочаш пісаць.Ты пісаў летась. Як я табе напісаў гэтак, дак ты загневаўся [неразбор.] мусіць ты стаў вялікім панам, што не хочаш пісаць пісем… Ці ты можа хворы, ці ты злуешся на нас, гэта мы ня ведаем, што гэта. Дык вот што калі ў цябе гэтакі характар, што табе не хочацца пісаць. Гэтак не добра рабіць… Ты мусіць на нас загневаўся за тое, што мы ў цябе грошай прасілі. А каб у нас былі грошы, так мы ў цябе не прасілі. Ты ведаеш, што ў нас доўгу руб. 18 і няма чым аддаць.”*

# Паўлюк Трус




Ліст бацькі Адама Паўлюку Трусу. 1928.



18




Бацькі пісьменніка Візарыёна Гарбука: Сцяпан Лявонцьевіч. і Ганна Васільеўна

# Вісарыён Гарбук

Сваіх дзяцей ў пісьменніка В. Гарбука не было. Пра яго бацькоўскі клопат да пляменнікаў і іх дзяцей даведваемся з лістоў ад родных. Гэта была сапраўдная сямейная падтрымка для пісьменніка, які прайшоў вайну, атрымаў інваліднасць і 14 гадоў быў прыкуты да ложка.

*З ліста пляменніцы Галі: "... ад Лёшы [муж пляменніцы] вялікае, вялікае дзякуй за брытву. Ён вельмі задаволены падарункам. А Зоечка [дачка пляменніцы] дзякуе вам за цукеркі і паштовачкі"*

# Вісарыён Гарбук


19

17

Здравствуйте дорогие, родные
тётя Люда и дедушка!
С приветом к Вам Зоя.
Извините, что я Вам долго не писала.
Нахожусь сейчас я в Наче.
У бабушек вашего адреса небыло.
А домой я хожу редко. Так ещё рас прошу
прощения.
Дедушка получили мы книгу и письмо.
За которое большое спасибо.
Живём мы все хорошо. Никто ещё не болел
Только бабушки жалуются на ноги.
А мне ничего не болит.
Я учусь в пятом классе.
Учусь я хорошо. У нас в классе 18
учеников. Девятять мальчиков и девять
девочек. Я сижу с Зинькевич Ириной.
Мы учимся в том самом классе.
В классе очень холодно. Как придём


20

18

из дому в пальто, так и сидим не
раздеваясь. На устных предметах
сидим в варежках, а на письменных в
варежках. Вот и всё о школе
Большой, большой привет Вам от
бабушек.
Больше писать нечего.
Пишите пожалуйста как Вы живёте,
здоровы ли?
До свидания.
Дедушка пишите мне по этому
адресу
В БССР
п/о Нача. Витебской обл.
Полоцкого р-на. д. Нача
Гарбук Надежде.

Ліст стрыечнай унучкі Зоі да пісьменніка Вісарыёна Гарбука

# Вісарыён Гарбук



[1361]

АЎТАБІЯГРАФІЯ

Нарадзіўся ў вёсцы Шкілякі Наўкага сельсавета на Полаччыне ў беднай сялянскай сям"і 24 лістапада ў 1913 годзе. Калі памёр бацька, а маці не пад сілу стала гадаваць, мяне ў 1922 годзе забраў да сябе дзядзька Язэп Васільевіч Ключонак – настаўнік пачатковай школы Чашніцкага раёну на Віцебшчыне. З яго дапамогай я скончыў школу сялянскай моладзі ў Чашніках і педагагічнае вучылішча ў Лепелі. У 1933 годзе пачаў працаваць настаўнікам Дварэцкай НСШ на Чашнічыне і адначасова вучыцца на завочным аддзяленні літфака Мінскага падінстытута. У тым жа годзе я пазнаёміўся з паэтам Міколам Хведаровічам, а пазней, калі ў 1935-6 г.г. вучыўся стацыянарна, пад яго кіраўніцтвам займаўся ў сэкцыі пачынаючых паэтаў пры Саюзе пісьменнікаў. Пісаў галоўным чынам вершы.

26 красавіка 1936г. органамі НКВД быў арыштаваны і па артыкулу 72 КК БССР сэсіяй Вярхоўнага суду асуджаны на тры гады зняволення ў лагерах. Вінаватым сябе не прызнаў ні на допытах, ні на судзе. Тэрмін зняволення адбываў на Калыме. Вярнуўшыся ў 1940 годзе, працаваў настаўнікам Мехаўскай сярэдняй школы і рыхтаваў да выдання першую кніжку твораў.

Вайна супыніла маю мірную працу. З першых дзён па 1947 год я знаходзіўся ў арміі. У складзе інжынерных войск у якасці тэхніка-рэкагнасцыроўшчыка і будаўніка прымаў удзел у абароне Масквы, у вызваленні Беларусі, Варшавы, на Віслянскім плацдарме, Одэры і ва ўзяцці Берліна. За баявыя заслугі маю чатыры ўрадавыя ўзнагароды.

Сям"і сваіх родных я ў жывых не застаў. У сакавіку 1944 году, за тры месяцы да вызвалення, лютуючы вораг спаліў усіх жыхароў вёскі Вішанкі Чашніцкага раёну. Разам загінула і мае родныя.

Аўтабіяграфія пісьменніка Вісарыёна Гарбука

# Аляксей Каўка

Дзень маці і Дзень бацькі даюць магчымасць згадаць аб праблеме сіроцтва, асабліва пасля Вялікай Айчыннай вайны. Літаратуразнаўца і гісторык Аляксей Каўка выхоўваўся ў дзіцячым доме, але праз усё жыццё меў моцныя сувязі з раднёй, нават пражываючы ў Маскве. Пра гэта сведчаць дакументы з яго фонду.




Провады А. Каўкі роднымі ў армію. 1956.

1-я чытацкая канферэнцыя па кнізе В. Катаева “Сын палка” ў Чэрвеньскім дзіцячым доме. 1950.







Выступленне будучага літаратуразнаўцы А. К. Каўкі на 1-й чытацкай канферэнцыі па кнізе В. Катаева “Сын палка” ў Чэрвеньскім дзіцячым доме. 1950.

# Аляксей Каўка

Літаратуразнаўца Аляксей Каўка з роднымі (у цэнтры, абдымае сястру А. Цыбіну, злева ў акулярах – дзядзька М. Каўка). 9 мая 1976, в. Машчаліна.



# Генадзь Бураўкін




Бацькі і цётка паэта Генадзя Бураўкіна. 1980-я.

# Генадзь Бураўкін

Паэт Генадзь Бураўкін з бацькамі Мікалаем Сцяпанавічам і Феняй Ягораўнай (яшчэ на фота цёткі Анюта і Хвядося, сястра Рыма). 1954. Полацк.



# Генадзь Бураўкін




**Песня пра маці**

Помню кожную рыску
І маршчынку тваю.
Над маёю калыскай
Помню ўсмешку тваю.

1972.

Генадзь Бураўкін з маці Феадосіяй Ягораўнай Бураўкінай. 2009.

# Уладзімір Дубоўка

Бацькаў наказ

… калі хто у сям'і
свет пакіне навек,
а ясней для цябе —
як памрэ чалавек,

дык павінна сям'я
самай першай вясной
палажыць пераход
над суседняй ракой.
…

Бацька мне наказаў:
«Слухай, сыне мой, сын!
Як памру —
не шкадуй на масток маставін!

За жыццё памясіў я
нямала балот,
панасіў на гарбу я
нямала турбот
дык няхай хоць патомак
сухою нагой
пройдзе ў памяць маю
над шумлівай ракой...»

Любы тата!
Апошні твой здзейсню наказ!
Не масточак,
а мост
мы намосцім за вас…

1960.




Анастасія Іванаўна – маці паэта Уладзіміра Дубоўкі. 1916-1920-я.

# Уладзімір Дубоўка

Паэт Уладзімір Дубоўка з сынам Альгердам і маці Анастасіяй Іванаўнай. 1935.




Масты паэт рабіў не толькі па сваім бацьку Мікалаю Фёдаравічу, але і па адзіным сыне Аліку. Хлопчык трагічна загінуў у 1942 годзе: разам з сябрамі кінуў знойдзены снарад у вогнішча.


31

М А Я   М А М А

Мая мама герой,
Хоць на фронце яна не была,
I з фашыстамI ў бой,
Яна смелым салдатам не йшла,
Не трымала яна
НI вIнтоўкI ў руках,нI гранат ,
КамандзIрам звяна
Была мама,вясковых дзяўчат.
Раным-рана яны
На палеткI калгасныя йшлI,
Дзе сIнелI Iльны
I блакIтнаю хваляй плылI,
Не апIшаш пяром
Той красы тонкалIстых сцяблIн,
Мая мама герой,
Герой працы,на роднай зямлI.
Паштальён у калгас
Шмат прыносIць сталIчных газет,
I,сягоння,якраз,
Там я ўбачыла мамIн партрэт.
НIжэй поле Iльну,
Дзе галоўкI буйныя,як град,
I - на гонар звяну,
Уся группа вясковых дзяўчат.
Вось яна I герой,
Хоць на фронце зусIм не была,
На палI,як набой,
Свой атрад яна з песняй вяла,
Залатае у яе
Зорка ярка гарыць на грудзях,
Песню шчасця пяе,мая мама,мой сонечны птах.

# Канстанцыя Буйло

Слова маці

Узніміце голас, маці! Каб вас чулі
У Нью-Йорку, Рыме, Лондане, Стамбуле.
Усюды – дзе аб рэваншысцкіх войнах
Задумаў думку хіжы вораг збройны;
Скажыце грозна: – Войн не будзе болей!
Вайну раздзьмуць ніколі не дазволім!

1970-я

Канстанцыя Буйло. Мая мама. 1960-я.

# Канстанцыя Буйло



## РАСКАЗВАЕ СЫН

Гутарка з Яўгенам КАЛЕЧЫЦАМ

Аляксей ГАРДЗІЦКІ.



А. К. Гарадзіцкі. Расказвае сын. Інтэрвью з Яўгенам Калечыцам пра яго маці – паэтку Канстанцыю Буйло. 1990.

# Спіс выкарыстынах матэрыялаў з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва:


1. Ф. 26. Воп. 1. Спр. 107. Л. 2
2. Ф. 414. Воп. 1. Спр. 34. Л. 1.
3. Ф. 500. Воп. 1. Спр. 687. Л. 1.
4. Ф. 316. Воп. 1. Спр. 780. Л. 1.
5. Ф. 66. Воп. 1. Спр. 1476. Л. 6b.
6. Ф. 66. Воп. 1. Спр. 1476. Л. 2b.
7. Ф. 277. Воп. 1. Спр. 572. Л. 1.
8. Ф. 277. Воп. 1. Спр. 572. Л. 2.
9. Ф. 277. Воп. 1. Спр. 399. Л. 1b.
10. Ф. 82. Воп. 2. Спр. 97. Л. 13.
11. Ф. 82. Воп. 2. Спр. 97. Л. 17.
12. Ф. 82. Воп. 2. Спр. 97. Л. 7.
13. Ф. 82. Воп. 2. Спр. 97. Л. 1.
14. Ф. 59. Воп. 3. Спр. 272. Л. 1.
15. Ф. 59. Воп. 3. Спр. 272. Л. 1b
16. Ф. 66. Воп. 1. Спр. 1488. Л. 3
17. Ф. 66. Воп. 1. Спр. 1488. Л. 4.
18. Ф. 234. Воп. 2. Спр. 204. Л. 1.
19. Ф. 234. Воп. 1. Спр. 207. Л. 17.
20. Ф. 234. Воп. 1. Спр. 207. Л. 18.
21. Ф. 234. Воп. 2. Спр. 150. Л. 1.
22. Ф. 340. Воп. 1. Спр. 957. Л. 1.
23. Ф. 340. Воп. 1. Спр. 950. Л. 1.
24. Ф. 340. Воп. 1. Спр. 950. Л. 2.
25. Ф. 340. Воп. 1. Спр. 957. Л. 3.
26. Ф. 520. Воп. 1. Спр. 516. Л. 5.
27. Ф. 520. Воп. 1. Спр. 516. Л. 2.
28. Ф. 520. Воп. 1. Спр. 519. Л. 9.
29. Ф. 27. Воп. 2. Спр. 26. Л. 1.
30. Ф. 27. Воп. 3. Спр. 42. Л. 1.
31. Ф. 263. Воп. 1. Спр. 46. Л. 1.
32. Ф. 263. Воп. 1_Спр. 153. Л. 1.